УДК [94+27-67-9](476)“1863/1914”(043.3)

# РОЛЯ КАТАЛІЦКАГА ДУХАВЕНСТВА Ў ПРАЦЭСЕ КАНФЕСІЙНЫХ КАНВЕРСІЙ НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

*Кароль М. М.*
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт
Мінск, Беларусь

***Анатацыя.*** *У артыкуле разглядаецца роля каталіцкага духавенства ў захаванні каталіцкага веравызнання сярод беларускага насельніцтва ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Аналізуецца яго ўплыў на свядомасць і рэлігійны выбар беларускага сялянства, адзначаюцца выпадкі пераходу ксяндзоў з каталіцызму ў праваслаўе, іх матывацыя і наступствы такіх пераходаў для тагачаснага грамадства.*

***Ключавыя словы:*** *канфесійныя канверсіі; Расійскай імперыя; каталіцызм; беларускія губерні; праваслаўе.*

# THE ROLE OF CATHOLIC CLERGY IN THE PROCESS OF CONFESSIONAL CONVERSIONS OF THE POPULATION OF BELARUSIAN GUBERNIAS IN THE SECOND HALF OF THE 19TH – EARLY 20TH CENTURY

*Karol M. M.*
Belarusian State Economic University
Minsk, Belarus

***Abstract.*** *The article examines the role of the Catholic clergy in preserving the Catholic faith among the Belarusian population in the second half of the 19th and the early 20th centuries. It analyzes their influence on the consciousness and religious choices of the Belarusian peasantry, identifies cases of priests transitioning from Catholicism to Orthodoxy, and explores the motivations behind these transitions as well as their consequences for contemporary society.*

***Keywords:*** *confessional conversions; Russian Empire; Catholicism; Belarusian gubernias; Orthodoxy.*

У другой палове XIX – пачатку XX ст. каталіцкае духавенства адыгрывала ключавую ролю ў захаванні каталіцкага веравызнання сярод беларускага насельніцтва. Святары былі не толькі духоўнымі апекунамі вернікаў, але і актыўнымі ўдзельнікамі жыцця грамадства.

Пасля паўстанняў 1830–1831 і 1863–1864 гг. улады перайшлі да правядзення абмежавальных мерапрыемстваў у дачыненні да каталіцкага духавенства. Апрача таго, у XIX ст. складаныя адносіны захоўваліся паміж Расійскай імперыяй і Ватыканам. Дыпламатычныя стасункі абцяжарваліся ўнутрана-палітычнай сітуацыяй у самой імперыі. Канкардат, заключаны ў 1847 г., быў разарваны ў 1866 г. пасля крытыкі папам рымскім Піем IX увядзення абмежавальных законаў у дачыненні да каталіцкага касцёла.

Фактычна каталіцкае духавенства на тэрыторыі Беларусі, асабліва пасля паўстання 1863–1864 гг., успрымалася расійскай адміністрацыяй як нелаяльная супольнасць. Такія адносіны не былі беспадстаўнымі. Ксяндзы нярэдка падтрымлівалі каталіцкую канфесійную ідэнтычнасць асоб, якія з пункту гледжання свецкай улады з’яўляліся праваслаўнымі. Пасля скасавання уніі на Полацкім царкоўным саборы 1839 г. былыя ўніяты фармальна былі залічаны ў шэрагі вернікаў праваслаўнай царквы. Але частка ўніяцкага насельніцтва ў гэты час больш схілялася да каталіцызму і насуперак рашэнням Полацкага сабора лічыла сябе вернікамі заходняга абраду. Пры гэтым адмова ад прыняцця праваслаўя, захаванне каталіцкай традыцыі жыхарамі беларускіх губерняў (найперш сялянамі) уладамі ўспрымалася не як самастойнае рашэнне, а як вынік падбухторвання з боку каталіцкіх святароў. Менавіта ксяндзоў будуць вінаваціць у тым, што яны таемнай прапагандай спакушалі адмаўляцца ад наведвання цэркваў, заахвочвалі трымацца каталіцтва.

Сітуацыя з таемнымі каталікамі абвастрылася пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг., калі па ініцыятыве пераважна свецкіх улад пэўную колькасць сялян каталіцкага веравызнання фактычна прымусова перавялі ў праваслаўе. Неўзабаве ўлады заўважылі, што новадалучаныя да праваслаўя вернікі, як і некаторыя «упартыя ў лацінстве» яшчэ з часоў скасавання уніі, не выконваюць абрадаў. У такім выпадку распачыналася следства для пошуку людзей, вінаватых у такім непадпарадкаванні. У першую чаргу ў садзейнічанні гэтаму падазравалі ксяндзоў бліжэйшых касцёлаў, якім, канешне, не падабалася такое скарачэнне ўласнай парафіі.

Віленскі віцэ-губернатар Пётр Баграцён у 1870 г. паведамляў мінскаму губернатару Уладзіміру Токараву, што перавод часткі каталікоў у праваслаўе выклікаў незадаволенасць каталіцкага духавенства. П. Баграцён прызнаваў, што назіраюцца выпадкі супраціўлення ініцыяваным звонку канверсіям, пачасцілася самавольнае вяртанне ў каталіцтва [1, арк. 22]. На думку віцэ-губернатара, асноўнымі завадатарамі непад-

парадкавання з'ўляліся менавіта ксяндзы, якія адчуваюць падтрымку вышэйшых каталіцкіх іерархаў [1, арк. 1 адв.]. Так, яшчэ ў 1865 г. за ксяндзом-капеланам Кімбараўскага жаночага кляштара (Мазырскі павет Мінскай губерні) Феліксам Урбіковічам за агітацыю праваслаўных да вяртання ў каталіцтва быў усталяваны галосны нагляд паліцыі [2. арк. 109а адв.–110, 190 адв.–191].

У 1860–1870-я гг. сялян шэрага вёсак Гродзенскага павета Гродзенскай губерні падавалі хадайніцтвы аб тым, каб іх прызналі каталікамі і далучылі да парафіян Рэплеўскага касцёла. У выніку гэта стала адным з рэдкіх выпадкаў, калі сялянам дазволілі адкрыта вызнаваць каталіцкі абрад. Але ксёндз Рэплеўскага касцёла Багдановіч, які ў вачах адміністрацыі з'яўляўся галоўным правакатарам непадначалення і падачы прашэнняў, быў пераведзены ў іншую парафію [3, арк. 33].

Ксяндзы істотна рызыкавалі, бо за выкананне над відавочна праваслаўнымі вернікамі абрадаў іншай веры прадугледжваліся пакаранні рознай суровасці: зняволенне, пазбаўленне сану і г. д. [4, с. 568].

З іншага боку, у гэты перыяд таксама назіраліся пераходы некаторых прадстаўнікоў духавенства з каталіцызму ў праваслаўе. Гэтыя пераходы часцяком былі матываваны не толькі асабістымі перакананнямі, але і сацыяльна-эканамічнымі фактарамі, такімі як эканамічны ціск, палітычная нестабільнасць і жаданне палепшыць жыццёвыя ўмовы. Пераход ксяндзоў у праваслаўе мог мець значныя наступствы для мясцовых супольнасцяў, бо гэта часта прыводзіла да расколу ў грамадстве, выклікала канфлікты паміж вернікамі розных канфесій і змяняла дынаміку адносін у рэгіёне.

Працэс канверсій часта адбываўся паралельна з закрыццём касцёлаў. Прыхаджан касцёлаў або далучалі да бліжэйшых у мясцовасці касцёлаў. або пераводзілі ўсім прыходам у праваслаўе. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывалі паводзіны ксяндза.

Вялікі розгалас атрымлівалі выпадкі, калі перавод часткі былых каталіцкіх вернікаў спалучаўся з прыняццем праваслаўя мясцовым ксяндзом. Кіраўнік Рэвізійнай камісіі Аляксей Старажэнка быў прыхільнікам такога спосабу арганізацыі масавага прыняцця праваслаўя. Ён меркаваў, што ў справе пераводу неабходна выкарыстоўваць каталіцкіх святароў, якія пагадзіліся прыняць праваслаўе, бо яны, на яго думку, былі падрыхтаваны для агітацыі ў падтрымку канверсіі. У дадзеным выпадку яны ўспрымаліся не як вернікі, а як людзі, якія за матэрыяльныя заахвочванні могуць не толькі самі, але і са сваёй парафіяй прыняць праваслаўе [5, р. 326].

Шырокую вядомасць набыў пераход у праваслаўе ксяндза Яна Стралецкага разам з прыхаджанамі Падбярэзскай парафіі Віленскага павета Віленскай губерні. Такія здарэнні былі выгадныя расійскім уладам не толькі ў сувязі з атрыманнем вялікай колькасці новых прыхаджан, але і для далейшай агітацыі. У такім выпадку можна было рабіць акцэнт на добраахвотным, негвалтоўным характары пераводаў у праваслаўе. Таму такія далучэнні шырока асвятляліся ў перыядычным друку [5, р. 327].

Рашэнне да змены канфесіі магло быць звязана як са зменамі уласных рэлігійных перакананняў, так і з імкненнем да сацыяльных і матэрыяльных выгод. Нягледзячы на тое, што ўлады заахвочвалі гэтыя пераходы, агулам яны ставіліся да былых ксяндзоў неадназначна. З аднаго боку, падобныя канверсіі выдатна служылі ў якасці зброі для прапаганды і агітацыі сярод каталіцкіх вернікаў, для чаго ксяндзы маглі нават заахвочвацца матэрыяльна да канверсій [6, с. 443]. З іншага боку, былыя ксяндзы ўспрымаліся як рэлігійныя перабежчыкі, што не магло спрыяць даверу да іх

Пераход ксяндза ў праваслаўе мог быць як актам індывідуальнага волевыяўлення святара, так і суправаджацца пераводам яго былых парафіян ва ўсходні абрад. У першым выпадку канверсіі, як правіла, не атрымлівалі шырокага розгаласу і не прыводзілі да істотных зрухаў у лакальнай супольнасці. Аднаасобна пераходзілі ў праваслаўе ксяндзы ў розных рэгіёнах – і там, дзе пераважала праваслаўнае насельніцтва (напрыклад, святар Бярэзінскага касцёла Казімір Пятровіч Бярнацкі [7, арк. 1]), і на тэрыторыях, дзе каталіцызм меў трывалыя пазіцыі. У 1866 г. праваслаўе прыняў Адам Будкевіч, які служыў у Аборкаўскім касцёле Ашмянскага павета Віленскай губерні [8, арк. 1]. Ксёндз з мястэчка Дукшты Новааляксандраўскага павета Ковенскай губерні Уладзіслаў Шалкоўскі ў 1867 г. пажадаў прыняць праваслаўе (мясцовы касцёл быў ліквідаваны ў наступным 1868 г.). Для праверкі трываласці яго перакананняў У Шалкоўскі быў накіраваны ў Віленскі Свята-Духаўскі манастыр, дзе таксама была засведчана яго палітычная добранадзейнасць. У выніку 4 мая 1869 г. яго просьба была задаволена, а ў наступным годзе У Шалкоўскі ўжо займаў пасаду святара Крэўскай царквы Ашмянскага павета [9, арк. 4].

Такім чынам, у другой палове ХІХ – пачатку ХХ ст. каталіцкія святары маглі як дапамагаць асобам, якія насуперак фармальнай прыналежнасці да праваслаўя лічылі сябе каталікамі, захоўваць уласную канфесійную ідэнтычнасць, так і, наадварот, садзейнічаць пераводу сваіх парафіян у праваслаўе.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 2184. – Ведамасці аб колькасці святароў і парафіян у каталіцкіх прыходах у Мінскай і Ковенскай губернях. 1870–1872 гг.

2. НГАБ. – Ф. 295. Воп. 1. Спр. 3661. – Ведамасць аб асобах, якія знаходзіліся пад наглядам паліцыі за 1881 г. па паветах Мінскай губерні. 1881–1882 гг.

3. НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Воп. 6. Спр. 1125. – Справа паводле прашэння сялян вёсак Дуляўцы, Альхова і Навасёлкі Слонімскага павета аб дазволе ім вызнаваць каталіцызм. 1867–1880 гг.

4. Уложение о наказаниях уголовных и исправительных 1866 года: с доп. по 1 янв. 1876 г. / сост. и авт. предисл. Н. С. Таганцев.; 2-е изд., перераб. и доп. – Санкт-Петербург: Тип. М. Стасюлевича, 1876. – 2, II, 726, X с.

5. *Сталюнас, Д.* Роль имперской власти в процессе массового обращения католиков в православие в 60-е годы XIX столетия / Д. Сталюнас // Lietuvių katalikų mokslo akademijos metraštis / Lietuvių katalikų mokslo akad. – Vilnius, 2005. – Vol. 26. – P. 307–347.

6. *Долбилов, М. Д.* Русский край, чужая вера: этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М. Д. Долбилов. – Москва: Новое Лит. обозрение, 2010. – 999 с.

7. LVIA. – F. 604. Ap. 5. B. 512. – Дело о переходе ксендза Казимира Бернацкого из католицизма в православие. 1865–1866 гг.

8. LVIA. – F. 604. Ap. 5. B. 554. – Дело о переходе ксендза Адама Будкевича из католицизма в православие. 1866 г.

9. LVIA. – F. 604. Ap. 5. B. 839. – Дело о переходе ксендза Владислава Шалковского из католицизма в православие. 1868–1870 гг.